# СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ

**Алегорыя** – ад грэч. *allēgoria* – іншасказанне – адлюстраванне абстрактных паняццяў ці з’яваў праз канкрэтныя вобразы; персаніфікацыя чалавечых якасцей з дапамогай аналогіі: баран – увасабленне тупасці, ліс – хітрасці, свіння – неахайнасці, конь – працавітасці.

**Алітэрацыя** – ад лац. *ad* – к, пры і *litera* – літара – від гукапісу, паўтарэнне зычных гукаў дзеля дасягнення мастацкай вобразнасці. Да прыкладу: “У бубны дахаў вецер б’е” (М. Багадановіч).

**Аналогія** – ад грэч. *analogia* – падабенства – прыём мастацкага пісьма, заснаваны на вызначэнні рысаў падабенства ў з’явах, прадметах, вобразах.

**Анафара** – паўторы слоў ці словазлучэнняў у пачатку вершаў, якія істотна ўплываюць на кампазіцыю твора, яго змест.

**Антытэза** – ад грэч. *antithesis* – супрацьпастаўленне – мастацкі прыём, які выкарыстоўваецца дзеля перадачы кантрастнасці паказанага. Антытэзы бываюць **сюжэтныя**, **кампазіцыйныя**, **тэматычныя** і г.д., грунтуюцца на **антаніміі**, што падчас выяўляецца ў назве твора: “Людзі і д’яблы” (К. Крапіва), “Агонь і снег” (І. Шамякін), “Свае і чужынцы” (І. Чыгрынаў).

**Архетып** – ад грэч. *arche* – пачатак і *typos* – вобраз – першавобраз, старажытны агульначалавечы сімвал, створаны міфалогіяй, фальклорам, культурай, аснова пазнейшых вобразаў: д’ябал – сімвал зла, Бог – сімвал дабрыні, чысціні, ахвярнасці, дрэва – сімвал жыцця і г.д.

**Асананс** – ад франц. *assonance* – сугучнасць – паўтарэнне аднатыпных галосных гукаў у мэтах мастацкай выразнасці (часцей ужываецца ў паэзіі): “*Дарагая зямля, радзіма! // Слова вымавіць немагчыма*” (А. Куляшоў).

**Асацыяцыя** – ад познелац. *associatio* – злучэнне – вобраз, заснаваны на выяўленні сувязей паміж канкрэтным і абстрактным, living рознымі з’явамі па ледзь бачных прыкметах падабенства: “парог, вычасаны з успамінаў” (Максім Танк), “срэбная нітка песні жаўрука” (Р. Барадулін).

**Аўтар** – ад лац. *auctor* – суб’ект дзеяння, заснавальнік, творца, які можа выяўляць сябе ў творы адкрыта і прыхавана, “ускосна” у залежнасці ад стылю, жанравай спецыфікі мастацтва і іншых фактараў.

**Байка** – кароткае дыдактычнае апавяданне ў вершах (радзей у прозе), з дзвюма кампазіцыйнымі часткамі: апісальнай і адточанай афарыстычнай мараллю, сатырычнае або павучальнае па змесце, алегарычнае.

**Балада** – ад франц. *ballade* – скокавая песня – жанр ліра-эпічнай, эпічнай, радзей – лірычнай паэзіі, з драматычным сюжэтам, трагічным фіналам. У эпоху рамантызму ў баладзе часцей, чым цяпер, скарыстоўваліся элементы патаемнасці, фантастыкі, міфалагічныя сюжэты. Балады бываюць фальклорныя (блізкія да песні) і літаратурныя.

**Белы верш** – нерыфмаваны, рытмічна арганізаваны сілаба-танічны верш. У паэзіі выкарыстоўваецца рэдка.

**Верлібр** – ад франц. *vers libre* – вольны верш – сістэма вершаскладання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нароўні з сілабічнай (складовік), заснаванай на захаванні аднолькавай колькасці складоў у радках, парнай жаночай рыфмоўкі, скарыстанні рознага тыпу цэзур; *сілаба-танічнай* (складова-націскной), у аснове якой захаванне пэўнай сістэмы чаргавання націскных і ненаціскных складоў у двух-(ямб, харэй, спандэй, пірыхій) і трохскладовых (дактыль, анапест, амфібрахій) стопах, гарманічнай, напеўнай, песеннай у аснове, найбольш распаўсюджанай у слоўным мастацтве тых народаў, мова якіх мае рухомы, зменлівы націск; *танічнай* (націскной), угрунтаванай на захаванні толькі аднолькавай колькасці націскных складоў у рыфмаваных радках; *дольнікам* (памежным вершаваным памерам паміж сілаба-танічным і танічным), калі радкі разбіваюцца на некалькі рытміка-інтанацыйных долей. Верлібр часцей за ўсё па зместу – разважанне, медытацыя, у якой пераважае доказнасць, лагічнасць, думка, а не пачуццё, хоць нярэдкія і выключэнні. Свабоднае мысленне ў верлібры спалучаецца з асацыятыўнай вобразнасцю, заснаванай на злучэнні канкрэтнага і абстрактнага паводле ледзь прыкметных, але вiдавочных змястоўных сувязей, падабенства.

У сусветнай літаратуры верлібр мае больш даўнія традыцыі, чым у беларускай, ім карысталіся схільныя да мадэрнізму П. Верлен, В. Брусаў, В. Хлебнікаў, М. Танк, карыстаюцца А. Вярцінскі, Я. Сіпакоў, А. Разанаў і інш. Ля вытокаў верлібра стаяў М. Багдановіч.

**Вобраз** – пераствораная ўяўленнем аўтара ці вымышленая ім карціна рэчаіснасці, свету, жыцця ў цэлым (макравобразы), яго асобных адметных рысаў (вобразы-дэталі, вобразы-тропы – мінівобразы). Вобраз звязаны з рэчаіснасцю ў значнай ступені (рэалістычны) і ў малой ступені (фантазійны).

**Вянок санетаў** – твор з 15 санетаў; апошні санет магістральны, складаецца з першых радкоў папярэдніх; кожны санет пачынаецца і заканчваецца адпаведнымі радкамі магістрала. Вянкі санетаў пісалі і пішуць А. Сербантовіч, Я. Сіпакоў і інш. паэты.

**Гераічнае і трагічнае ў літаратуры –** эстэтычныя катэгорыі, звязаныя з паняццем пафасу (ад грэч. pathos – страсць, пачуццё) і адпаведнага яму зместу. Вылучаюцца наступныя разнавіднасці пафасу: гераічны, трагедыйны, сатырычны, сентыментальны, гумарыстычны і інш. Але часцей за ўсё ў адным творы, а тым болей у творчасці пісьменніка ў цэлым аб’ядноўваюцца разнавіднасці пафасу: трагедыйны і сатырычны (трагікамедыі А. Макаёнка), сентыментальны і гумарыстычны (“Ідылія” В. Дуніна-Марцінкевіча).

**Гіпербала** – ад грэч. *hyperbole* – перавага, лішак – прыём мастацкага перавялічэння з’явы ці яе складнікаў, часты ў казках, былінах, легендах, баладах. Яркія ўзоры яе далі А. Куляшоў у “Баладзе пра вока”, П. Панчанка ў баладзе “Герой”.

**Гістарычны раман** – жанравая разнавіднасць рамана. У аснове падобных твораў гістарычная тэматыка, рэальныя падзеі, героі. Грунтуецца на дакументах, кампенсаваць адсутнасць якіх можа далёка не кожны аўтар. У беларускай літаратуры пачатак гістарычнай прозе паклаў польскамоўны празаік Юзаф Крашэўскі, які напісаў сотні раманаў, а пазней – Вацлаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ластоўскі аповесцю “Лабірынты”, Максім Гарэцкі “Віленскімі камунарамі” і “Камароўскай хронікай”. На сучасным этапе сапраўднымі майстрамі раскрыцця гістарычнай тэматыкі з’яўляюцца Леанід Дайнека (раманы “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”), Таіса Бондар (аповесць “Спакуса”), Алег Лойка (раман-эсэ пра Я. Купалу “Як агонь, як вада”, раман “Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае”). Ды неперайзыдзеным майстрам гістарычнага рамана стаўся Уладзімір Караткевіч.

**Драма** – ад грэч. *drama* – дзеянне – 1) род літаратуры, заснаваны на дзеянні, у дыялогавай форме; 2) жанр драматургіі, прамежкавы паміж трагедыяй і камедыяй часцей з сямейна-бытавым ці на гістарычную тэму сюжэтам. Некаторыя даследчыкі літаратуры вылучаюць таксама ў асобныя роды літаратуры сатыру і тэле-, кінадраматургію. Тэрмін “драма” сведчыць, што аснову драматычных твораў складае дзеянне. Паводле канцэпцыі асобных навукоўцаў (А. М. Весялоўскі, Г. Гачаў) гэты род літаратуры вылучыўся з сінкрэтычнага (цэласнага) мастацтва на аснове “афармлення” дзеяння словам, эпас вырас з распеўнага расказвання вядучага хора – карыфея, і, нарэшце, лірыка – з выгукаў – рэакцыі хора на карыфеевы словы. Драматургічныя творы “распадаюцца” на тры асноўныя жанры – трагедыю, камедыю і ўласна драму, якая з’явілася параўнальна пазней, чым два першыя, у эпоху Сярэднявечча. Асобныя драматычныя жанры, у сваю чаргу, могуць складацца з некалькіх разнавіднасцей.

**Дэталь мастацкая** – ад франц. *detail* – падрабязнасць, дробязь, прыватнае – міні-вобраз у творы, які мае глыбокае значэнне, часам выяўляе аснову яго зместу, пафас. Ролю дэталі часта выконваюць назвы твораў: “Подых навальніцы” (І. Мележ), “Плач перапёлкі” (І. Чыгрынаў), “Далёка да акіяна” (А. Куляшоў), “Маўклівая малітва” (П. Панчанка), “Memento mori” (Я. Брыль).

**Жанр літаратурны** – ад франц. *ganre* – род – тып літаратурных твораў, адметны пафасам, зместам, формай. Жанры лірыкі – элегія, ода, пасланне, верш-роздум і г.д., эпасу – раман, аповесць, апавяданне, нарыс, навела, паэма, эпапея і г.д., драмы – трагедыя, камедыя, драма, трагікамедыя, фарс, вадэвіль і г.д.

**Ідэя** мастацкага твора – ад грэч. *idea* – паняцце, уяўленне – галоўная думка твора, якая вынікае з яго зместу, абумоўлена аўтарскай пазіцыяй і чытацкім разуменнем. **Ідэйны змест** – комплекс ідэй твора. У рамане І. Шамякіна: заклік да дабрыні, выкрыццё двурушніцтва і здрадніцтва, сцвярджэнне пераемнасці спраў пакаленняў і г.д.

**Інверсія** – ад лац. *inversio* – перастаноўка – парушэнне граматычнай паслядоўнасці мовы з мэтай дасягнення мастацкага эфекту. Часцей назіраецца ў лірыцы: “Жыццё закон нязломны мае: // Ніколі парўда не ўмірае” (М. Багдановіч), “Але і салодкі ад дружбы быў // Мой хлеб надзённы” (М. Танк).

**Інтрыга** – ад грэч. *intricare* – заблытваць – складаны ланцуг падзей у творы як вынік адпаведнага заблытанага зместу. Часта выяўляецца ў навэле,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дэтэктыўным рамане (“Чорны замак Альшанскі” У. Караткевіча).

**Камедыя –** ад грэч. *komos* – вясёлы натоўп і *ōdē* – песня, гімн – жанр драмы. “Герой” камедыі – смех, заснаваны на гумары, іроніі, сарказме, сатыры, іх прыёмах пісьма. Можа быць адпаведна гумарыстычнай, іранічнай, сатырычнай, лірычнай. Бываюць камедыі сітуацый (творы А. Макаёнка), характараў (творы К. Крапівы, А. Макаёнка).

**Кампазіцыя –** ад лац. *compositio* – складанне, упарадкаванне – пабудова твора, яго сюжэта, сродак раскрыцця характараў, сутнасці з’яў. Бывае складанай (раманы) і простай (апавяданне, нарыс).

**Канфлікт у драматычным творы.** Канфлікт – гэта супярэчнасць, ён з’яўляецца асновай любога твора, нават лірычнага, апісальна-сузіральнага, у якім выяўляецца лагодны і памяркоўны настрой. Бываюць канфлікты вострасацыяльныя, маральна-этычныя, бытавыя, прымірымыя ці непрымірымыя, адзінкавыя і тыповыя. Ёсць і так званыя вечныя канфлікты, што становяцца асновай філасофскіх твораў: жыццё і смерць, дабро і зло, святло і цемра, шчасце і бяда, пачуццё і абавязак.

У драматычных творах звычайна некалькі канфліктаў: цэнтральны, галоўны, і пабочныя, якія развіваюцца паралельна з асноўным. Кожны з іх мае свой пачатак, кульмінацыйны пункт развіцця, спад, таксама, як і сюжэт. Вакол канфлікту грунтуецца дзеянне, групуюцца героі.

**Кульмінацыя –** ад лац. *culmen* – вяршыня – найвышэйшы момант развіцця дзеяння ў творах. Пасля кульмінацыі дзеянне ідзе на спад. У “Сэрцы на далоні” І. Шамякіна – гэта аперацыя на сэрцы Зосі Савіч.

**Лірыка –** ад грэч. *lyrikos* – музычны, напеўны – род літаратуры, самы суб’ектыўны (Гегель, Бялінскі), пра стан чалавечай душы, перададзены праз вобраз-перажыванне. Лірыцы ўласцівая павышаная эмацыянальнасць, сціслацсь выказвання, абагуленасць пачуццяў; у ёй узрастае роля слова, тропа, сродкаў паэтычнага сінтаксісу, рытмікі і інтанацыі. Перажыванні разгортваюцца часцей у форме цяперашняга часу. Аўтар становіцца лірычным героем. Можна вызначыць лірыку апісальную (бліжэйшую да эпасу), выяўленчую, дыдактычную (павучальную), філасофскую. Па тэматыцы лірыка бывае грамадзянскай, пейзажнай, любоўнай (інтымнай), сатырычнай і г.д.

**Лірычны герой** – гэта ў чыста лірычных творах сам аўтар. Лірычны герой – не копія самога аўтара, а яго ідэал ці нават травестацыя, пераліцоўка мастака (што бывае значна радзей). Ён роўны аўтару па духу, па спосабу мыслення. У мэтах канспірацыі аўтар можа прынізіць свае магчымасці і здольнасці, выступіць у некалькі іншай ролі. Але ў цэлым лірычны герой падобны на свайго аўтара. Мастацкі вобраз (а такім і з’яўляецца вобраз лірычнага героя) больш шматгранны, чым дакументальная аснова, дадае да рэчаіснасці новыя рысы, надточвае яе, стараецца ліквідаваць у рэчаіснасці, што стала яго асновай, “заганнасць”. Лірычны герой, такім чынам, і сам аўтар, і плён яго фантазіі. Мастак можа ствараць і вобраз ролевага героя, як гэта зрабіў, напрыклад, той жа Купала ў вершы “Калгасніца”, і весці размову

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з чытачом яго вуснамі. Нярэдкі ў лірыцы і вобраз героя – двайніка аўтара (Чорны чалавек С. Ясеніна, Сам Я. Купалы).

**Літаратурны тып –** літаратура на працягу доўгіх стагоддзяў стварыла многа запамінальных характараў, тыпаў. Гэта і тыпы даволі абагульненыя, падобныя адзін да аднаго героі і злодзеі ў творах класіцыстаў (“Тарцюф” Мальера, “Карнель” Расіна, у некаторай ступені героі Сумарокава, Фанвізіна). Рэалістычнае мастацтва стварае адметныя, непадобныя тыпы, з жывымі рысамі, складанымі характарамі. Беларуская літаратура, як і іншыя літаратуры, улічвае пры стварэнні тыповых вобразаў і нацыянальны менталітэт, і гістарычнае развіццё краіны, і псіхалагічныя фактары. Выдатныя тыпы беларускай жанчыны – рамантычна настроенай летуценніцы Ядвісі (Я. Колас), жартаўніцы, рабіны-прыгажуні, кемлівай, светлай, здольнай за сябе пастаяць, але акружанай трагічнымі абставінамі Ганны Чарнушкі (Іван Мележ), маўклівай гаспадыні, па-філасофску засяроджанай у сабе Ганны (Я. Колас, “Новая Зямля”), нязломнай перад страшэннай сілай, здольнай заступіцца за чужых, як за сваіх сыноў, і пайсці ў імя дабра на смерць Маці (апавяданне Я. Брыля “Маці”) – стварыла беларуская літаратура.

У рэалістычным мастацтве тыповае ствараецца не па прынцыпу механічнага адбору з многага падобных рыс, а па прынцыпу пошуку больш характэрнага, таго, што можа быць у наступным агульным, адметным. Тыповае нараджаецца самім жыццём. Гэта сінтэз агульнага і канкрэтнага, як і сам мастацкі вобраз. Сінтэз рэальнага і створанага фантазіяй мастака. Гэта – вынік ацэнкі мастаком рэальнасці.

**Літота –** ад грэч. *litotes* – прастата – прыём, адваротны гіпербале – перамяншэнне. Выразна выкарыстаны Д. Свіфтам у “Вандраванні Гулівера”.

**Мадэрнізм** – гэта агульная назва напрамкаў, якія парываюць з традыцыямі XIX стагоддзя, з рэалізмам і выяўляюць суб’ектывісцкае, індывідуалістычнае светабачанне. У адрозненне ад рэалістаў, якія прызнаюць першаснасць зместу і тэматыкі, *мадэрністы сцвярджаюць прыярытэт формы і сродкаў выяўлення.* Такім чынам, рэалісты і мадэрністы размяжоўваюцца ў вызначэнні прыярытэтаў паміж аб’ектыўным і суб’ектыўным, у адзінстве зместу і формы, ва ўвазе да ідэйна-тэматычнага пласта і пласта вобразна-выяўленчых сродкаў.

Сярод мадэрнісцкіх школ і напрамкаў вылучаюць плыні авангардысцкага і неа(пост)авангардысцкага накірункаў. Паняцце *“авангардызм”* стала больш ужывальным за паняцце *“мадэрнізм”*, яно азначае найноўшыя дасягненні ў той ці іншай сферы літаратуры і мастацтва. У выяўленчым мастацтве першай чвэрці XX стагоддзя вылучыліся заснавальнікі *кубізму* Жорж Брак і Пабла Пікаса. Пад яго ўплывам складвалася і творчасць *лідэра авангарда* ў Парыжы французскага паэта *Гіёма Апалінэра.*

*Футурысты* свядома парывалі з традыцыямі класічнай літаратуры, абагаўляючы тэхніку і свет, у якім перамагае хуткасць і энергія. Футурысты вядомыя і сваімі заклікамі да гвалту, да вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Экспрэсіяністы* адлюстравалі ў сваёй творчасці ўнутраныя перажыванні суб'екта. Дзеля больш дакладнага іх узнаўлення яны перадавалі навакольны свет у скажоных вобразах. Так, у мастацтве экспрэсіянізму былі распрацаваныя вобразы "крыку": карціна "Крык" нарвежскага мастака Эдварда Мунка, "крык-драма" ў Германіі (Эрнст Толер, Георг Кайзер).

На хвалі антываеннага пратэсту ўзнік *дадаізм,* прадстаўнікі якога адкрыта адмовіліся ад удзелу ў вайне, ад традыцый папярэдняга мастацтва. Дадаісты ўпершыню ператварылі мастацтва ў антымастацтва: падмяніўшы мастацкі твор прадметам рэчавага свету, яны "растварылі" мастацтва ў рэчавым свеце, вылучылі абсурднасць як асобны мастацкі прыём.

Сферу неўсвядомленага прызналі крыніцаю мастацтва прадстаўнікі *сюррэалізму* (тэрмін вынайдзены Апалінэрам), якія ўводзілі ў мастацтва "ашаламляльныя" вобразы: "облезлое солнце пожирает удары топора" (Лейрыс), "куст – красный, как яйцо, когда оно зелено" (Андрэ Брэтон). Аўтаматызм пісьма, спалучэнне неспалучальнага, прадметнасць навыварат, калі матэрыяльнае губляе сваю матэрыяльную абалонку, а ідэальнае набывае рэчавае ўвасабленне, увага да гуказапісу і адмаўленне ад знакаў прыпынку і іншае – усё гэта вызначае мастацкі метад і паэтыку сюррэалістаў.

*Метад "плыні свядомасці"* ўвайшоў у шырокі ўжытак у пачатку XX стагоддзя дзякуючы творчасці Джэймса Джойса, Марсэля Пруста і інш.

У другой палове XX стагоддзя пашырыліся *неаавангардысцкія кірункі* і школы: *тэатр абсурду, школа "новага рамана" ў Францыі, "канкрэтная паэзія" ў Англіі* і інш. Тэатр абсурду, прадстаўлены найперш драматургамі Сэмюэлем Бекетам і Эжэнам Ёнэска, выяўляе ідэю татальнага адчужэння ў грамадстве, немагчымасць людзей зразумець адзін аднаго, ідэю татальнай (духоўнай, маральнай, фізічнай) дэградацыі чалавека. Эксперыментальныя пошукі прадстаўнікоў "новага рамана" былі зведзеныя да таго, каб "ачысціць" свет ад чалавечага "я", ад непаўторнасці суб'ектыўнага ўспрымання, выключыць сюжэт і зняць дзеючых асоб, паказаць наваколле ў "чыстым" выглядзе, такім, якое яно нібыта і ёсць на самай справе.

**Мастацкая дэталь** – літаральна гэта міні-вобраз, якім можа быць лаканічнае апісанне прыроды, вылучэнне нейкай рысы знешнасці героя, яго манеры гаварыць, хадзіць, жэстыкуліраваць, троп – эпітэт, метафара, параўнанне, нават адно слова. Але ўсё названае становіцца вобразам-дэталлю толькі тады, калі набывае вялікае сэнсавае значэнне, пралівае святло на ацэнку падзей у творы, на яго ідэйны пафас, на характар таго ці іншага героя. Мастацкая дэталь заўсёды шматгранная і шматзначная.

**Метафара –** ад грэч. *metaphora* – прыхаванне, перанясенне –ужыванне слова ці выраза ў пераносным значэнні праз супастаўленне пэўнай з'явы ці прадмета з іншай з'явай ці прадметам на аснове агульных для іх адзнак і ўласцівасцей, аднасастаўнае параўнанне, у адрозненні ад класічнага параўнання, заснаванае часцей за ўсё на адухаўленні з'яў: "На струнах хвой спявае вецер"; "Пакліч – былое адгукнецца" (А. Куляшоў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Міф –** ад грэч. *mythos* – слова, паданне – казанне, у якім выяўляюцца погляды далёкіх нашых продкаў на свет, жыццё, з'явы прыроды, пра багоў, асілкаў і г.д. Многія міфы занатаваныя ў Бібліі, леглі ў аснову літаратурных твораў (У. Караткевіча, напрыклад).

**Персанаж** – ад лац. *persona* – твар, маска – дзейная асоба мастацкага твора.

**Постмадэрнізм –** гэтае паняцце выкарыстоўваецца ў розных значэннях. З аднаго боку, ім пазначаецца асобны перыяд у развіцці сусветнай літаратуры XX стагоддзя, які адметны наяўнасцю самых разнастайных працэсаў: цэнтрабежных і цэнтраімклівых, раз'яднання і аб'яднання, палярызацыі і сінтэзу, спрэчкі і дыялога і г. д. З другога боку, ён разглядаецца і як заканамерны этап развіцця літаратуры, якая процістаіць рэалізму. У другой палове XIX стагоддзя гэта была дэкадэнцкая літаратура, у першай палове XX – літаратура мадэрнізму, з 1960-х гадоў даследчыкі прасочваюць узнікненне і распаўсюджванне постмадэрнізму.

Для *постмадэрнізму ключавымі з'яўляюцца паняцці "тэкст"* (па-за яго межамі нічога не існуе), *"інтэртэкстуальнасць"* (гэты тэкст убірае ў сябе самыя розныя элементы іншых тэкстаў, таксама розных літаратурных эпох і нацыянальных літаратур і г. д.)" *"гульня"* (творца разбурае звыклыя схемы, сістэмы, вобразы і з элементаў стварае новыя схемы, фрагменты, вобразы ў адмысловым, прынцыпова несістэмным, хаатычным парадку), *"іронія"* (якая ўласцівая гэтай "гульні" і прасякае ўсю "дэканструкцыю" наскрозь) і інш. Постмадэрнізм і азначае гэты шлях татальнага разбурэння і яднання на прынцыпова новых асновах дзеля стварэння новай універсальнасці. Творчасць у постмадэрнісцкім кірунку патрабуе не толькі вытанчанага мастацкага густу, але і грунтоўнай літаратурнай, філасофскай, культуралагічнай падрыхтоўкі. Невыпадкова гэта мастацтва прызнанае элітарным – процілеглым па сутнасці і форме сучаснай "масавай культуры".

**Прататып** – ад грэч. *prōtotypon* – рэальная гістарычная асоба, якая набыла рысы тыповасці і стала персанажам твора.

**Прытча** – дыдактычнае апавяданне, заснаванае на алегорыі, іншасказанні з часоў старажытнасці. Прытчы ў канцы XX стагоддзя пісаў В. Быкаў, пішуць Я. Сіпакоў, Л. Галубовіч, іншыя пісьменнікі.

**Раман –** ад ст.-франц. *romans* – апавяданне – жанр эпічнай літаратуры, з ускладненым зместам, разгалінаваным сюжэтам. Раманы бываюць сацыяльнымі, філасофскімі, сямейна-бытавымі, прыгодніцкімі, дэтэктыўнымі, сатырычнымі. Прыклад апошняга – "Запіскі Самсона Самасуя" А. Мрыя. У Беларусі на польскай мове раманы пісалі Ян Баршчэўскі ("Шляхціц Завальня"), Ю. Крашэўскі, Э. Ажэшка ў XIX стагоддзі. У XX стагоддзі – Ядвігін Ш. ("Золата"), Цішка Гартны ("Сокі цаліны"), М. Зарэцкі ("Сцежкі-дарожкі", "Вязьмо"), К. Чорны ("Пошукі будучыні", "Вялікі дзень", "Трэцяе пакаленне"), І. Мележ (трылогія "Палеская хроніка"), І. Шамякін ("Сэрца на далоні", "Атланты і карыятыды" і інш.), У. Караткевіч ("Каласы пад сярпом тваім"), І. Чыгрынаў, Б. Сачанка і іншыя аўтары. Раман ведала антычная і сярэдневяковая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(рыцарская) літаратура.

**Рэалізм –** ад познелац. *realis* – сапраўдны – мастацкі метад, які сцвердзіўся ў беларускай літаратуры ў першай палове XIX стагоддзя і “замацаваўся” ў творчасці Ф. Багушевіча. Асноўныя прынцыпы: праўдзівасць, шырокі ахоп рэчаіснасці, глыбіня яе аналізу, тыпізацыя з’яў і герояў (“жыццё ў форме самога жыцця”), дакладнасць малюнкаў, сінтэз сацыяльнага і бытавога, народнасць, адпаведнасць формы, зместу і г.д. Вядучы і ў сучаснай беларускай літаратуры (пры наяўнасці ў ёй прыкметаў мадэрнізму і пастмадэрнізму).

**Стыль –** ад грэч. *stylos* – стрыжань для пісьма – выразнік індывідуальных асаблівасцей творчасці пісьменніка (стыль аўтара), літаратуры пэўнага напрамку (рамантычны, рэалістычны, мадэрнісцкі), твора (лірычны стыль апавядання Я. Брыля “Галя”). Ёсць паняцце стыль эпохі (XX стагоддзя, напрыклад), раманны, эпічны, лірычны і інш. Стыль вызначае (яднае) агульныя прыкметы твораў ці творчасці.

**Сюжэт –** ад франц. *sujet* – прадмет – сістэма падзей, якая вызначае змест эпічных, ліра-эпічных, драматычных твораў, сродак раскрыцця характараў (М. Горкі). Сюжэты бываюць храналагічныя (“Палеская хроніка” І. Мележа) і прычынна-выніковыя (творы І. Шамякіна).

**Традыцыі і наватарства ў паэзіі** – паняцці ўзаемазвязаныя. Новае ў літаратуры, мастацтве, грамадскім жыцці з’яўляецца як адкрыццё і адмаўляе традыцыйнае, часта састарэлае. Так адбылося ў сусветным літаратурным працэсе адмаўленне аднаго літаратурнага напрамку другім: класіцызму – сентыменталізмам, а затым рамантызмам, рамантызму – класічным рэалізмам XIX, а затым XX стагоддзяў. Рэалістычнае мастацтва прэваліруе ў нашым стагоддзі, але паступова выцясняецца з многіх літаратур свету (маюцца на ўвазе развітыя) мадэрнізмам і неамадэрнізмам. Новае, нерэалістычнае мастацтва грунтуецца на прынцыпах суб’ектывізацыі, пераўтварэння рэчаіснасці свядомасцю мастака часам да непазнавальнасці, на фармальнай раскаванасці творчасці, свабодным спалучэнні ў ёй фантастычнага, выдуманага, рэалістычнага, чарадзейнага і многіх іншых прынцыпаў. Традыцыйнае і наватарскае ў паэзіі, у літаратуры ў цэлым цесна пераплятаюцца, суседнічаюць у творчасці аднаго і таго ж пісьменніка, Так, нават самы арыгінальны паэт сучаснасці (старэйшае пакаленне) М. Танк кнігі “Збор калосся”, “Мой каўчэг” напалову склаў з класічна-суразмерных, сілаба-танічных вершаў.

**Трагедыя –** ад грэч. *tragos* – казёл і *ōdē* – песня – жанр драмы, што з’явіўся ў старажытныя часы паводле абраду ў гонар бога вінаградарства і віна Дыяніса, знешне падобнага на казла, а пазней – сатыра з невялікімі рожкамі і барадой. Канфлікты ў трагедыі абвостраныя, невырашальныя, прыводзяць герояў-праўдашукальнікаў ці заблытаных у жыцці да смерці. Трагедыі пісалі Шэкспір (“Гамлет”), Пушкін (“Барыс Гадуноў”).

**Троп –** ад грэч. *tropos* – паварот – мінівобраз, заснаваны на ўжыванні слова ці выразу ў пераносным значэнні (параўнанне, метафара, сінекдаха,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

метанімія, сімвал і інш.), нясе ў сабе адбітак уяўленняў старажытнага чалавека аб свеце, з’явах як жывых істотах.

**Тып** – ад грэч. *typos* – аддрукоўка, узор – мастацкі вобраз – плён фантазійнага мышлення аўтара твора, які выяўляе галоўную сутнасць з’явы, падзеі, асобы. Вобразы-тыпы – вынік руху літаратуры да рэалістычнага, праўдзівага перасатварэння ў іншабыццё ў слове рэчаіснасці. Тыповае – не абавязкова агульнае, але абавязкова значнае, вызначальнае.

**Утопія** – ад грэч. *utopos* – *u* – няма і *topos* – месца – твор, у якім апісваецца неажыццявімая мара як сапраўды існуючая. Першая утопія – аповесць Томаса Мора (XV ст.) пад такой назвай. **Антыўтопія** – твор адваротнага зместу, у якім выкрываецца падобная светапоглядная арыентацыя мастака. У гэтым плане антыўтопіямі можна лічыць раман А. Платонава “Катлаван”, А Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя” і іншыя сатырычныя творы XX стагоддзя.

**Экзістэнцыялізм.** Філасофія і літаратура *экзістэнцыялізму* надзвычай выразна выявіла гэтае адчуванне расколатасці свету, пошукі ўласных шляхоў у новых умовах, сфармулявала думку пра неабходнасць выбару і праблему адказнасці чалавека за свой выбар. Паняцце “экзістэнцыялізм” паходзіць ад слова “экзістэнцыя”, што значыць “існаванне”. Асноўныя паняцці экзістэнцыялізму зводзяцца да наступнага.

Паняцце “сітуацыя” – “пагранічная”, крызісная, у якую бывае пастаўлены чалавек у часы складаных выпрабаванняў, перад пагрозаю смерці або ў выніку смерці, хваробы блізкіх, або калі ён захоплены моцным пачуццём (напрыклад, каханне), або перад вялікім спакушэннем (здрадніцтва, раптоўнае багацце, узвышэнне і інш.). І ў дадзенай сітуацыі чалавек павінен зрабіць той ці іншы выбар, памятуючы і пра тое, што “нават у тым выпадку, калі нічога не выбіраю, тым самым я ўсё ж выбіраю” (Сартр). Таму “выбар у сітуацыі” – складаная перадумова канфлікту, сюжэта, пабудовы характару ў гэтай літаратуры.

Паняцце “свабода” – ключавое ў філасофіі экзістэнцыялізму. Чалавек уяўляецца свабодным – ад усяго таго, што можа быць прыўнесена грамадствам, – ад рэлігійных, палітычных, сацыяльных і іншых поглядаў і схільнасцей, ад грамадскіх і маральных норм, ад сямейных і пачуццёвых сувязей і г.д., значыць, ад сябе прыдуманага, што навязанае чалавеку і што не з’яўляецца сутнасцю самога жыцця. І менавіта ў гэтых умовах, застаўшыся сам-насам з уласным, толькі і дадзеным яму ад прыроды быццём, ён ажыццяўляе сябе, робіць свой сапраўдны выбар.

Паняцце “адказнасць” разглядаецца як расплата не толькі фізічнымі пакутамі, смерцю, але і пакутамі душы, сумлення, маральнымі пакутамі за зроблены выбар. У выніку развіцця філасофскіх палажэнняў у творчасці пісьменнікаў-экзістэнцыялістаў паявілася і такое паняцце, як “вернасць выбару”, “застацца верным аднойчы зробленаму выбару” (у Камю). На думку экзістэнцыялістаў, прагрэсу няма, гісторыя сляпая, і ёй няма

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ніякай справы да чалавека. Таму чалавек, які аднойчы выбраў свой шлях змагання са злом, павінен “заставацца верным” свайму выбару і нават “дзейнічаць без надзеі на поспех”.

**Элегія** – грэч. *elegeia* – жалобная песня, ад *elegos* – скарга – верш, у якім выяўляецца смутак, журба, меланхолія з прычыны грамадскай несправядлівасці, сямейнага няшчасця і асабістага гора.

**Эпас –** ад грэч. *epos* – слова, апавяданне – род літаратуры, які грунтуецца на апісанні фактаў, падзей, стварэнні аб’ектывізаваных вобразаў герояў, пададзеным як бы без удзелу аўтара. Апошнім часам эпас лірызуецца (раманы У. Караткевіча, Я. Брыля), драматызуецца (узрастанне ролі дыялогавага пачатку, актывізацыя дзеяння). Эпас – асноўны спосаб адлюстравання рэчаіснасці і паказу аўтарскіх адносін да свету і чалавека ў ім – апавядальны. Эпічны род літаратуры звычайна падзейны. Падзеі, пра якія апавядаецца, складваюцца ў сюжэт, счэпліваюцца ў цэласнасць і будуюць твор. Побач з сістэмай падзей у эпічным творы існуюць апісанні – карціны, так ці іначай падпарадкаваныя сюжэту, працуючыя на характары, адасобленыя ад аўтара, самастойныя персанажы. Персанажам, удзельнікам падзей, вобразам, героем эпічнага твора можа быць таксама сам аўтар (калі ад яго імя вядзецца апавяданне) ці яго двайнік – давераная асоба, адбітак яго самога, ці ролевы герой. Падзеі ў апавядальным, эпічным творы адбыліся, засталіся ў мінулым часе, пра што звычайна і сведчыць сам аўтар ці апавядальнік твора: “Дзеялася гэта даўно, яшчэ за даўнім часам...” У падзейную тканіну апавядальных твораў уваходзяць маналогі, дыялогі, пейзажныя карціны, дакументальныя застаўкі, публіцыстычныя і філасофскія адступленні аўтара. У цэлым эпічны твор стараецца прадставіць чытачу больш-менш закончаную карціну, сцэну жыцця ці панарамны яго адбітак у цэлым (гераічныя паэмы, раманы-эпапеі, пенталогіі, тэтралогіі, трылогіі, цыклы раманаў і г. д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ